# Анатоль Пятровіч Грыцкевіч: чалавек, навуковец, грамадзянін

Анатоль Пятровіч Грыцкевіч – адна з найбольш значных і цікавых асоб, якіх мне давялося ведаць, і вельмі цяжка ахарактарызаваць яго некалькімі рысамі. Пачаць можна з таго, што Анатоль Пятровіч – гэта загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, пад кіраўніцтвам якога я пачала сваю працу ва ўніверсітэце ў жніўні 2001 г. Знешне гэта высокі, салідны, інтэлігентны чалавек, з бездакорнымі манерамі і адмысловай беларускай мовай. Яго манеру трымацца можна было б назваць старасвецкай – сапраўды, у яго гаворцы, жэстыкуляцыі, постаці адчувалася тое, што называецца «шляхетнасць» і з'яўляецца не толькі вынікам адмысловага выхавання, але і адпаведных працоўных зносін у пэўным асяроддзі. Падкрэсленая ветлівасць, гумар, часта інтэлектуальны, з гістарычнымі прыкладамі, рэспектабельнасць, адсутнасць паспешлівасці і мітусні – вось рысы Анатоля Пятровіча, якога, дарэчы, знешне не псаваў дастаткова сталы ў 2001 г. узрост. Па першых гадах працы Анатоль Пятровіч мне такім і запомніўся – як салідны начальнік, нават патрыярх, які перад кожным вучэбным годам асабіста распісваў нагрузку кожнаму выкладчыку. Дарэчы, почырк Анатоля Пятровіча быў таксама своеасаблівы – убачыўшы хоць раз, яго не зблытаеш з іншым.

Аднак думаць, што такі абаяльны чалавек з'яўляецца лагодным і мяккацелым, было б памылкай. Анатоль Пятровіч мог трымаць дыстанцыю, быць прынцыповым, бескампрамісным і цвёрда адстойваць сваё меркаванне. І памяць у яго была моцная і на добрае, і на дрэннае. Іншая справа, што, часам назіраючы, калі і як праяўляюцца гэтыя якасці Анатоля Пятровіча, я не магу ўзгадаць выпадкаў, што гэта было б беспадстаўна, асабліва ў навуковай сферы.

У мяне заўсёды выклікала захапленне адукацыя Анатоля Пятровіча – медыцына, замежная мова і гісторыя. Замежная мова, з якой бы прафесіяй яна ні спалучалася, – нязменны атрыбут адукаванай асобы. Гэта было ў любую эпоху, і нельга не пагадзіцца з афарызмам, які на рускай мове гучыць так: «Сколько языков ты знаешь, столько раз ты – человек». Значна цікавей спалучэнне медыцыны і гісторыі.

Зразумела, што ў свой час у выбары прафесіі Анатолем Пятровічам галоўнымі былі тыя меркаванні, что ўрач – гэта заўсёды паважаны, адукаваны і патрэбны чалавек. А калі яшчэ медыкі ёсць у сям'і (маці Анатоля Пятровіча была вядомым урачом), то ўсё падаецца цалкам натуральным. Але ўсё ж перамагла любоў Анатоля Пятровіча да гісторыі, і індывідуальны выбар быў у гэтым галоўным. Аднак мне падаецца, што справа тут не толькі ў ім. Пры ўсіх адрозненнях прафесіі ўрача і гісторыка маюць шмат агульнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-першае, гэта пошук адказаў на пытанні аб сутнасці і жыцці арганізма – чалавечага і сацыяльнага, жаданне даведацца аб тым, што вонкава не бачна, шукаць, эксперыментаваць, лячыць, даваць веды. Па-другое, і вопытны ўрач, і ўдумлівы гісторык бачаць і ведаюць нашмат больш таго, што даступна радавому чалавеку. Тое, што прадстае перад іх вачыма, далёка не заўсёды прывабнае, добрае ці прымальнае з пункту гледжання маралі і здаровага сэнсу. Хваробы арганізма, як і заганы грамадства, рэаліі войнаў, спецыфічныя звычаі і норавы, прадстаўленыя непадрыхтаванаму чалавеку, могуць нанесці немалую псіхалагічную траўму. Аднак і для ўрача, і для гісторыка гэта – прафесійныя рэаліі, для разумення якіх лішнія эмоцыі толькі шкодзяць. Вытрыманасць, разважлівасць, уменне прааналізаваць праблему і прыкласці максімум сіл для яе вырашэння – вось неад'емныя рысы кваліфікаванага гісторыка і ўрача.

Па-трэцяе, ні ўрач, ні гісторык не могуць ведаць усяго і гарантаваць поўны поспех як лячэнню, так і рэканструкцыі і разуменню мінулага. Пры ўсіх сучасных тэхналогіях і методыках як у медыцыне, так і ў гістарычнай навуцы абодва спецыялісты маюць дачыненне да таго, што атрымана вопытным шляхам ці захавалася ў крыніцах, і зыходзяць з уласнага вопыту і адпаведнага стану навукі. Нарэшце, і для ўрача, і для гісторыка абавязковы прынцып «не нашкодзь!» і асэнсаванне адказнасці за тое, што яны робяць.

Не ведаю, наколькі б пагадзіўся Анатоль Пятровіч з маімі думкамі, калі б у нас была магчымасць зараз паразмаўляць. Але падаецца, што атрымалася б цікавая гутарка, тым больш што ў мяне быў падобны шлях у прафесію гісторыка (спынілася перад выбарам: паступаць у медыцынскі інстытут, ці ў педагагічны на гістарычны факультэт).

На жаль, пры жыцці Анатоля Пятровіча штодзённая ўніверсітэцкая праца пакідала мала часу для няспешных размоў на тэмы, што выходзілі за межы бягучых спраў. Шкада і таго, што некаторыя бакі навуковай дзейнасці Анатоля Пятровіча раскрыліся для мяне ў поўнай меры толькі ў апошнія гады. Маецца на ўвазе комплекс пытанняў айчыннай гісторыі XVI–XVIII стст., упершыню прадстаўленых у беларускай гістарыяграфіі А. П. Грыцкевічам.

Развіццё Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай – гэта тыя раздзелы гісторыі Беларусі, якія і ў расійскай дарэвалюцыйнай, і асабліва ў савецкай гістарыяграфіі лічыліся «не сваімі». І галоўнымі аргументамі ў гэтым было сцвярджэнне таго, што ВКЛ – гэта «дзяржава літоўскіх феадалаў», а Рэч Паспалітая – «феадальна-прыгонніцкая панская Польшча». Таму, маўляў, няма чаго іх асабліва вывучаць, а калі гэта і рабіць – то выбарачна. Напрыклад, разглядаць сацыяльна-эканамічнае развіццё, фальваркавую гаспадарку, прыгонніцтва, рэлігійныя праблемы і, зразумела, класавую барацьбу, асабліва казацка-сялянскія войны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з падкрэсліваннем таго, як беларускі народ яшчэ з XVII ст. імкнуўся ўз'яднацца з Расіяй. Пытанні ж развіцця дзяржаўных інстытутаў, унутранай і знешняй палітыкі былі выціснуты на перыферыю гістарычных прац.

Пры такім падыходзе шмат прабелаў стварылася ў гісторыі Рэчы Паспалітай. Велізарны пласт інфармацыі, што датычыўся адносін Княства і Кароны, аналізу функцыянавання і рэфармавання дзяржаўных інстытутаў, спроб рэцэпцыі абсалютысцкіх норм у дзяржаўнае кіраванне, комплекснага вывучэння ўнутранай палітыкі, палітычнай і прававой культуры, кіруючай эліты, нарэшце, персаналій правіцеляў практычна быў па-за разглядам навукоўцаў да пачатку 1990-х гг. Для спецыялістаў, якія валодалі польскай мовай, значнай крыніцай інфармацыі, несумненна, былі працы Ю. Бардаха і іншых польскіх гісторыкаў. Аднак для тых, хто не ведаў польскай мовы на такім узроўні, існаваў інфармацыйны вакуум.

І менавіта ў гэты момант, калі адбывалася станаўленне Беларусі як суверэннай краіны і фарміраванне ўласна нацыянальнай гістарыяграфіі, з'явіліся артыкулы Анатоля Пятровіча. У 1992 г. і пазней на старонках газеты «Культура» быў змешчаны шэраг публікацый, якія распавядалі аб знешняй і ўнутранай палітыцы, правіцелях і вядомых асобах Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стст.

На той момант гэта было вельмі важна – беларускі чытач адкрываў для сябе невядомыя, але ад гэтага не менш цікавыя і змястоўныя старонкі айчыннай гісторыі. Важнасць навукова-папулярнай літаратуры наогул нельга перабольшыць, калі гаворка ідзе аб адраджэнні гістарычнай памяці. Публікацыі Анатоля Пятровіча, звернутыя да шырокага чытача, адрозніваліся высокім навуковым узроўнем і фактычнай насычанасцю. Як чалавек метадычны, скрупулёзны, нават педантычны, ён не дапускаў недакладнасць і неахайнасць у сваіх работах. Асабліва варта адзначыць напісаныя А. П. Грыцкевічам гістарычныя артыкулы для энцыклапедый. Так, для другога тома энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае» ён у 2006 г. напісаў 95 артыкулаў агульным аб'ёмам 138 старонак.

Айчынная гісторыя XVI–XVIII стст. у пашыраным фармаце стала прадстаўляць перад чытачом пачынаючы з прац А. П. Грыцкевіча першай паловы 1990-х гг. Пазней, у 2000 г., з'явіцца «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае» М. І. Ермаловіча, у 2001 г. – «Нарыс гісторыі Беларусі» Г. М. Сагановіча, дзе значная ўвага нададзена XVI–XVIII стст. У 2000-х гг. выйшлі працы Ю. М. Бохана, В. Ф. Голубева, А. А. Скеп'ян і іншых айчынных даследчыкаў, увага якіх скіравана на гісторыю Беларусі ранняга Новага часу. Аднак гэта будзе потым, а пракладаць шлях новаму праблемнаму полю ў навуцы давялося А. П. Грыцкевічу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, можна сцвярджаць, што А. П. Грыцкевіч – фігура знакавая і сімвалічная ў айчыннай гістарыяграфіі. Пачаўшы сваю навуковую дзейнасць у савецкія часы, займаючыся першапачаткова традыцыйнай сацыяльна-эканамічнай тэматыкай (прыватнаўласніцкімі гарадамі XVI–XVIII стст.), ён адрадзіў для вывучэння айчынную гісторыю ранняга Новага часу. Акрамя таго, звярнуў увагу на спрэчныя, ідэалагічна завостраныя праблемы айчыннай гісторыі першай чвэрці XX ст. – Кастрычніцкую рэвалюцыю, Грамадзянскую вайну, савецка-польскую вайну, Слуцкае паўстанне і, зразумела, гісторыю БНР.

А. П. Грыцкевіч працаваў на зломе эпох, ва ўмовах навуковай і палітычнай палемікі, прыкладаючы сілы для стварэння менавіта нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі. Водгалас гэтых спрэчак застаўся і ў маёй памяці, калі Анатоль Пятровіч быў загадчыкам кафедры. Слухаць яго меркаванні, каментарыі, крытычныя заўвагі было заўсёды не толькі цікава, але і карысна. Але час паказаў, што нягледзячы на запал дыскусій, іх ідэалагічную афарбаванасць, узаемныя прэтэнзіі апанентаў, напісанае Анатолем Пятровічам не толькі засталося і выканала сваю ролю, але і было прадоўжана.

Калі ў студзені 2015 г. навукоўцы, грамадскія дзеячы, калегі, студэнты развітваліся ў Чырвоным касцёле з Анатолем Пятровічам, уражвала колькасць людзей, якія прыйшлі, каб выказаць павагу, шчырае прызнанне, спачуванне родным і блізкім. Поўны храм, у якім яшчэ заставалася калядлнае ўбранне, урачыстае набажэнства, прамовы, у якіх гучалі заслугі нябожчыка не толькі перад айчыннай, але і еўрапейскай навукай і грамадскім супольніцтвам, – усе гэта не магло не ўзрушваць. Але разам са смуткам усе больш прабівалася іншае пачуццё. Адчуванне і разуменне таго, што яркі талент, інтэлектуальны, актыўны чалавек пражыў доўгае, цікавае, змястоўнае жыццё, якога, па маштабе зробленага, хапіла б на некалькіх. Ён пакідаў нас урачыста, сярод зімовага спакою, зрабіўшы тое, што застаецца назаўсёды. Аб такім завяршэнні жыцця – пачэсным, значным – можа марыць любы чалавек.

Зараз перада мной ляжыць адна з кніг А. П. Грыцкевіча «Старонкі нашай мінуўшчыны». Гэта выданне 2009 г., прысвечанае 80-годдзю Анатоля Пятровіча. Тут змешчана, па сутнасці, самае выбітнае з яго вялікай навуковай спадчыны, пачынаючы ад ужо згаданых артыкулаў 1990-х гг. Звяртаюць на сябе ўвагу напісаныя аўтарам на вокладцы аўтограф з найлепшымі пажаданнямі і дата – 5 траўня 2009 года. Сёння, праз дзесяць гадоў, па-новаму ўспрымаецца і разумеецца маштаб асобы А. П. Грыцкевіча, яго ўнёсак у навуку і ўсведамленне таго, што зробленае ім павінна развівацца далей.

*Л. У. Ландзіна*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 25.01.2019.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ